мошчы прападобнага пакутніка Афанасія былі перавезены ў Маскву. Пасля рэвалюцыі ацалелыя часціцы мошчаў вывезлі за мяжу. І толькі ў 1995 годзе з’явілася магчымасць вярнуць назад невялікую частку мошчаў у сабор. У правым куце храма, дзе да 1915 года спачывалі мошчы, цяпер стаіць адрэстаўраваная рака і знаходзіцца часціца мошчаў Афанасія Брэсцкага. У 2005 годзе гэтаму святу быу ўведзены помнік каля сабора.

У храме прысутнічаў таксама спіс з цудатворнай Холмскай іконы Божай Маці, старажытны абраз Свяціцеля Мікалая Цудатворца ў срэбнай рызе і пазалочаным кіёце, якая некалі належала Мікалаеўскай Кафедральнай царкве, дзе праходзіў уніяцкі сабор 1596 года.

Літаратура:
1. Брестский Симеоновский Собор. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://drevo-info.ru/articles/18034.html. – Дата доступа: 22.09.2024.

## АДМЕТНАСЦЬ ПАРТРЭТНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ГЕРОЯЎ У АПАВЯДАННІ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА «ХАТА»

**Рубель А. В.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук Тарасава С. М.

Партрэт (франц. portrait) – гэта апісанне знешняга выгляду, адзення, рухаў, позы літаратурнага персанажа. Партрэт – адзін з галоўнейшых сродкаў індывідуалізацыі і тыпізацыі вобраза-персанажа [1, с. 171].

Вывучэнню літаратурнага партрэта, яго ролі ў творы было прысвечана шмат даследаванняў беларускіх і расійскіх літаратуразнаўцаў: артыкулы «Праблема партрэта ў мастацкай літаратуры» А. Кунавіна, І. Кунавінай (2017), «Партрэт-апісанне як адзін з асноўных мастацкіх прыёмаў выявы літаратурнага героя» В. Шынкевіч (2017), «Мастацкая спецыфіка літаратурнага партрэта ў мемуарнай прозе» Ю. Панамаровай (2018) і інш. Сярод прац беларускіх даследчыкаў варта вылучыць манаграфію прафесара А. Пяткевіча «Партрэт у літаратурным творы: Партрэтная характарыстыка герояў рамана Івана Мележа «Людзі на балоце» (1988).

Проза Вячаслава Адамчыка, вядомага беларускага празаіка, драматурга з пакалення «шасцідзясятнікаў», – удзячны матэрыял для даследавання партрэта герояў, бо аўтар – той пісьменнік, які імкнецца да дакладнасці і праўдзівасці ў паказе канкрэтнага часу і канкрэтнага чалавека ў часе.

Творчасці В. Адамчыка прысвечана шмат публікацый, сярод якіх даследаванні М. Тычыны, В. Бароўкі, Н. Дамброўскай, Н. Апанасовіч, Г. Тычко,

Репозиторий ГрГМУ

Ю. Шчукі, Я. Лецкі і інш. Аднак праблеме партрэтавання персанажаў у крытычных працах названых даследчыкаў увагі практычна не ўдзялялася.

Пры ўсёй разнастайнасці класіфікацый партрэта ў творчасці Вячаслава Адамчыка, праявілі сябе найбольш такія тыпы, як партрэт-апісанне і партрэт-параўнанне. Так у апавяданні В. Адамчыка «Хата» са зборніка «Дзікі голуб» (1972), які прызнаны адным з лепшых узороў малой прозы пісьменніка, названыя тыпы партрэтаў дапамагаюць рэалізацыі аўтарскай задачы – дакладна паказаць жыццёвыя перыпетыі чалавека-вяскоўца, які паволі разрывае свае сувязі з домам, родным кутом. У творы аўтар канцэнтруе ўвагу на асобе героя Мішкі Галубца, які пераязджае жыць у горад і вырашае прадаць родную хату.

Для характарыстыкі персанажаў апавядання аўтар выкарыстаў партрэт-апісанне і партрэт-параўнанне, якія адразу фарміруюць уяўленне пра чалавека, указваюць на прыналежнасць героя да пэўнай сацыяльнай групы. У творы партрэт-апісанне перарастае ў псіхалагічны, калі знешнасць служыць сродкам перадачы рысаў характару чалавека, раскрывае яго ўнутраны свет. Так, праз партрэтнае апісаннне галоўнага персанажа Мішкі Галубца В. Адамчык перадае растрывожаны стан душы, які прыехаў у апусцелую без бацькоў хату, каб назаўсёды развітацца з ёю. Але найперш аўтар падкрэслівае ў яго аблíччы дэталі гарадскога, важнага хлопца: *«без шапкі, у белай нейлонавай рубашцы, у модных, як носяць цяпер, з шырокім поясам і вузкаватых у сцёгнах штанах»* [2, с. 92].

Побач з Мішкам кантрасна выглядаюць вяскоўцы, звычайныя сельскія працаўнікі. Так, напрыклад, партрэт Самуся Дзедзіча, які купляе хату, даклада падае нам аблічча простага вясковага чалавека – *«каваля з суседняе вёскі, што адмарозіў пальцы: некаторае зімы ішоў з запоін дадому і заснуў на ганку»* [2, с. 92]. *«Цяпер Дзедзіч трымаў у куксах, прыціскаючы гэтымі двума пальцамі, жоўты складаны метр і прыкладваў яго да сцяны – мераў хату»* [2, с. 92].

У той жа час аўтар пастаянна трымае ўвагу на галоўным герої, паказвае нам праз дэталі яго выгляду, як мяняецца яго настрой, адчуванні. Так, падчас агледзін і продажу хаты Мішка стаў паніклы і разгублены: *«прытаптаў акурак і нехаця пасунуўся за мужчынамі»* [2, с. 93], *«апрануўся і яшчэ доўга сядзеў на лаве пры акне, глядзеў, як заходзіла за чорную хмару сонца»* [2, с. 102].

Праз згадку асобных дэталяў партрэту В. Адамчык «ажыўляе» ўспаміны Мішка пра вясковае дзяцінства і знаёмых яму людзей, напрыклад, пра сябра Косцю Палусіна, які *«зламаў сабе руку»* [2, с. 93], настаўніка матэматыкі, *«што замазваў чарнілам пазбіваныя ў туфлях перады і да самага цяпла насіў зімовую шапку»* [2, с. 96]. З болем у сэрцы ўспамінае герой самага дарагога яму чалавека – сваю хворую маці, пра якую захаваўся ўспамін, што яна *«націрала ромам ногі і ён вельмі ж добра памагаў ёй»* [2, с. 94], як яна *«зачырванеўшыся і выціраючы аб хвартух закасаныя да локцяў рукі, мыла бялізну»* [2, с. 96].

Партрэт-параўнанне аўтар выкарыстаў пры апісанні вечарынкі ў Аўдоллі. Пры аглядзе прысутных гасцей Мішку зрабілася нязвыкла, што ў новым для яго часе няма на вечарынцы хлопцаў *«расчырванелых, у шапцы з брылём на патыліцу, п'янаватых»* [2, с. 103], *«што соўгаліся маладыя хлопцы, як калекі,*



Репозиторий ГрГУ

*перастаўляючы ногі»* [2, с. 103], *«няма тых дзяўчат, што некалі спявалі – на лаве каля радыёлы сядзелі адныя маладзенькія, з вострымі тварыкамі»* [2, с. 104].

Ад успамінаў пра мінулы і ўжо цалкам незваротны для героя час яму стала няўтульна і прыкра – *«сыры холад стаў красціся Мішку за плечы»* [2, с. 109]. Выявілася, што бацькоўская хата ва ўспрыманні героя – гэта своеасаблівы свет, звязаны з памяццю рода, звычаямі гэтай мясцовасці.

Такім чынам, у апавяданні «Хата» В. Адамчык, рэалізуючы задуму – паказаць непазбежны разрыў чалавека з яго родным домам, з блізкім па духу асяроддзем, актыўна выкарыстоўвае апісанне знешнасці чалавека. Праз партрэтную характарыстыку персанажаў дакладна выяўляецца іх сацыяльны статус, раскрываюцца перажыванні, перадаецца спецыфіка часу і абставін.

Літаратура:


1. Рагойша, В. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. Рагойша. – Мінск : Народная асвета, 2009. – 303 с.
2. Адамчык, В. Дзікі голуб / В. Адамчык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1972. – 192 с.


Рэпазіторый ГрГМУ

## МАРФАЛАГІЧНАЕ ПАСТАЯНСТВА І ЗДОЛЬНАСЦЬ ДА РЭАЛІЗАЦЫІ МАРФАЛАГІЧНЫХ ФОРМ ПРЫСЛОЎНЫХ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ


**Салейка В. У.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук, дац. Садоўская А. С.


Марфалагічныя асаблівасці фразеалагічных адзінак вызначаюцца ў залежнасці ад таго, з якой часцінай мовы яны суадносяцца, у сувязі з чым даследчыкі вылучаюць назоўнікавыя, прыметнікавыя, дзеяслоўныя, прыслоўныя, мадальныя, выклічнікавыя і несуадносныя з часцінамі мовы фразеалагічныя адзінкі [1, с. 102]. Аб’ектам нашага даследвання сталі прыслоўныя фразеалагізмы.

У пераважнай большасці яны з’яўляюцца марфалагічна нязменнымі адзінкамі, бо як і прыслоўі, не рэалізуюць граматычных катэгорый, Марфалагічная нязменнасць абумоўлена іх семантыкай і структурнымі асаблівасцямі. Так, напрыклад, амаль трэцяя частка прыслоўных фразеалагізмаў рэалізуе сваё значэнне ў спалучэнні са словамі-суправаджальнікамі: рабіць, працаваць, цягнуць *як чорны вол*; ісці, пайсці *куды вочы вядуць*; пачынаць (пачаць) *з азоў*; даставацца *на арэхі*; *на бабах* заставацца (застацца); плакаць, лезці *як вош на струп*; расплакацца *як бабер.* Нязменнасць некаторых адзінак абумоўлена тым, што яны рэалізуюць асаблівасць кіраваць